*К.А. Дзічкоўская*

## КАНЦЭПТ «CAMPANILISMO» У ІТАЛЬЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ

На сучасным этапе культурна-гістарычнага развіцця цэнтральнай універсаліяй карціны свету становяцца праблемы *ідэнтычнасці асобы,* краіны, культуры, нацыянальнасці. Паняцце ідэнтычнасці асобы азначае цвёрда засвоены і асобасна прымаемы вобраз ва ўсім багацці адносін да навакольнага свету, пачуццё адэкватнасці і стабільнага валодання уласным «Я» і сітуацыяй, здольнасць асобы да паўнацэннага рашэння задач, якія ўзнікаюць перад ёй на кожным этапе яе развіцця [1, с. 20].

*Ідэнтычнасць краіны* ўяўляе паняцце, якое азначае «самавызначальнасць» нацыі «наконт асноўных каштоўнасцей, арыентацый у свеце, прызнанне гэтых каштоўнасцей і арыентацый большасцю насельніцтва, гэта таксама цэласны вобраз краіны (сукупнасць характарыстык), які робіць яе зразумелай для іншых краін» [2, с. 7]. Аснову ідэнтычнасці складаюць нацыянальныя каштоўнасці, якія сцвердзіліся ў часе, гістарычнай калізіі, што становяцца асновай нацыянальных міфаў і сімвалаў.

*Культурная ідэнтычнасць* вызначае суаднесенасць чалавека з пэўнай культурай, яго прыналежнасць да яе і ўсведамленне гэтага факта. Гэта працэс, праз які сацыяльны суб'ект пазнае сябе і здольны канструяваць сэнсы, галоўным чынам на аснове дадзенай культурнай уласцівасці або яе сукупнасці.

*Нацыянальная ідэнтычнасць* – гэта прыналежнасць да пэўнай нацыі з яе адзіным разумением традыцый і законаў грамадзян, што яе складаюць.

Актуалізацыя праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці выклікана глыбокімі зменаннямі, якія адбываюцца ў свеце. У іх ліку асаблівасці сацыяльнай сітуацыі, змяненне геапалітычнай прасторы, парушэнне прывычных культурных сувязей, пашырэнне ўплыву сродкаў масавай камунікацыі і інфармацыі і праблема граніц культурнай прасторы, што параджаецца імі, пытанні захавання ўласнай нацыянальнай і культурнай ідэнтычнасці. Крызіс культурнай ідэнтычнасці, які мы ўсе перажываем, заключаецца ў «памяншэнні індывідаў з калектыўнай рэальнасцю, якую яны раней падтрымлівалі (адмаўленне сімвалаў распад калектыўнай памяці, прадстаўленай традыцыямі, страта веры ў агульнае, перапыннасці ў гісторыі, пачуццё непаўнацэннасці адносна больш дасканалай культуры)» [3, с. 121].

«Развіццё нацыянальнай культуры любога народа прадуктыўна толькі на базе агульначалавечых каштоўнасцей, якія ў сваю чаргу своеасабліва праяўляюцца ва ўкладзе жыцця кожнага народа. Менавіта яны ляжаць у аснове жыццядзейнасці, вызначаючы духоўнае развіццё...» [4, с. 15]. Агульначалавечыя каштоўнасці ў рэальным жыцці праламляюцца праз этнічную своеасаблівасць, нягледзячы на тое, што ў мінулым этнакультурная спецыфіка праяўлялася ў большай ступені, чым у наш час.

У сучасных умовах нівеліроўкі і стандартызацыі шматлікія даследчыкі, пісьменнікі і журналісты спрабуюць вызначыць самабытнасць Італіі і яе народа. Італьянскі пісьменнік Энца Біаджы пісаў аб тым, што Італія не існуе, на што Уільям Уорд адказаў: «Канешне ж, Італія існуе, хоць складаецца яна з многіх адрозных адна ад адной абласцей» [5, с. 1– 2]. Варта адзначыць, што тэрытарыяльна арганізаваны свет гэтай краіны як дзяржавы сапраўды поўны супярэчнасцей. І па наш час кожная італьянская вобласць валодае ўласным воблікам, унікальным, асаблівым характарам. Маючы некалькі цэнтраў прыцягнення, дзяржаву падраздзяляюць на тры вялізныя зоны – паўночную, цэнтральную і паўднёвую. Аднак гэта драбленне даволі ўмоўнае, у сапраўднасці адрозненняў намнога больш.

Пачуццё прыналежнасці – адна з характэрных рыс італьянскага народа. Італьянцы атаясамліваюць сябе па прыналежнасці, прызнаюць адзін аднаго праз асацыяцыю сябе з пэўнымі сімваламі. Палітычная прыналежнасць не такая важная, як раней. Этнічная прымета і геаграфічнае месца пражывання ў наш час значны (як і некалькі стагоддзяў назад), паколькі маюць векавыя карані і выражаюцца ў саперніцтве паміж абласцямі, гарадамі і мястэчкамі. Італьянец дакладна ведае, адкуль ён родам, і ганарыцца гэтым. Калі пераязджае ў іншы горад ці жыве далека ад сваёй радзімы, ён ніколі не страчвае сувязі з бацькоўскай хатай, і невыпадкова знакамітыя палітычныя кіраўнікі дапамагаюць роднаму гораду і землякам.

Паходжанне чалавека цесна звязана з такім ключавым для італьянцаў паняццем *campanilismo,* што ў перакладзе з італьянскага абазначае мясцоўнасць, рэгіяналізм (*campanilismo* італ. – званіца). У Італіі захаваліся неймаверная колькасць вежаў і званіц.

Старажытныя і параўнальна маладыя, велічныя і сціплыя, падаючыя і прамыя – усе гэтыя высотныя збудаванні сталі неад'емнай часткай горадабудаўнічых воблікаў шматлікіх італьянскіх гарадоў. Па колькасці сучасных небаскробаў краіна не стане канкурыраваць са шматпавярховымі гарадамі Азіі або Амерыкі, аднак па колькасці высотных збудаванняў, якія прайшлі праверку часам, Італія па праве займае вядучае месца ў свеце. *Campanilismo* – значыць агляд са сваёй званіцы, адданасць роднаму дому, лепш за які не знайсці. Ранейшае саперніцтва паміж такімі некалі магутнымі гарадамі, як Фларэнцыя, Мілан, Мантова і шмат іншымі, прадаўжаецца і да нашага часу ў тыпова італьянскай манеры, калі кожны італьянец праяўляе месны патрыятызм, ганарыцца сельскай званіцай, сваім горадам, які з'яўляецца для яго самым прыгожым. Пры знаёмстве італьянцы не забываюць запытаць адзін у аднаго, з якога яны горада. Некаторыя нават не называюць свайго імені, а толькі месца, дзе пражываюць. Італьянцы аддана любяць родныя мясціны і з цяжкасцю адрываюцца ад іх.

Варта адзначыць, што з часоў рымскай эпохі ў Італіі ніколі не было ўласнай агульнай гісторыі, таму жыхарам Апенінскага паўвострава засталіся ў спадчыну сапраўды імперскі гонар, амбіцыёзнасць і адданыя адносіны да ўсяго свайго – выключнага і унікальнага. Яны праяўляюцца ва ўзаемаадносінах італьянцаў паміж сабой. Час ад часу італьянцы спрабуюць усвядоміць сябе адзіным народам і нават праявіць некаторыя рысы нацыяналізму (італьянская футбольная каманда заваёўвае Кубак Свету або лыжнік Алберта Томба ставіць шэсць рэкордаў запар). У астатнім жыхары Італіі адчуваюць сябе італьянцамі толькі ў далечыні ад Радзімы.

*Campanilismo* выражаецца ў самых разнастайных і стракатых формах і манерах. Кожны італьянец з'яўляецца балельшчыкам пэўнай футбольнай каманды. «За якую футбольную каманду ты хварэеш?» – адно з самых распаўсюджаных пытанняў пры знаёмстве, якое задаецца пасля: «Дзе ты жывеш?». Геаграфічная ідэнтыфікацыя, атрыманая такім спосабам, характарызуе незнаёмца раней, чым ён загаварыў. Такім чынам, ствараецца аб'ектыўнае меркаванне аб незнаемым чалавеку.

У Італіі прысутнічае вялікая лінгвістычная разнастайнасць. Існуе шмат дыялектаў, на якіх размаўляюць на тэрыторыі дзяржавы. Італьянская мова носіць ганаровае званне «дзяржаўная мова Італіі» і «агульнанародная мова італьянскага народа». Шматлікія мясцовыя дыялекты Італіі могуць быць зведзены ў 3 групы: дыялекты Поўначы, Цэнтра і Поўдня Італіі. Вобласці Італіі не падобны адна на адну. На працягу многіх стагоддзяў, а таксама пасля аб'яднання краіны, адзіным сродкам вусных зносін вялізнай часткі насельніцтва, не здольнай размаўляць па-італьянску з-за непісьменнасці, былі аўтаномныя мовы, вытворныя ад лацінскай мовы, і мясцовыя дыялекты.

Гаворачы аб святах, можам меркаваць, што ў кожнай вобласці існуюць свае звычаі. У грамадскім жыцці вобласці, горада або вёскі, свята – важная падзея: гэта зручны выпадак весялосці, сустрэч і абмену, які таксама з'яўляецца элементам і спосабам самаідэнтыфікацыі месца. У любым мястэчку Італіі галоўнейшым святам у годзе з'яўляецца святкаванне святога заступніка горада. У гэты дзень закрыты школы, магазіны і

грамадскія ўстановы, арганізуюцца працэсіі, танцы, латарэі, перасоўныя рынкі, дзе прадаюцца мясцовыя гастранамічныя прадукты, прыгатаваныя спецыяльна з выпадку свята. 24 чэрвеня ў Фларэнцыі святкуюць дзень святога Іаана Хрысціцеля. З гэтай нагоды на плошчы Сеньёрыі перад знакамітай галерэяй Уфіцы дзве каманды ў касцюмах эпохі Адраджэння спаборнічаюць у гульні з мячом, якая, як лічаць італьянцы, з'яўляецца правобразам сучаснага футбола. 29 чэрвеня жыхары Рыма не працуюць – адзначаюць Дзень святых Пятра і Паўла. Кожны горад і веска адзначаюць дзень свайго святога: Мілан – Амвросія, Турын – Іаана, Неапаль – Януарыя, Рым – Пятра [8].

Кожная нацыя валодае пэўнымі аб'ектыўнымі прыкметамі, якія адрозніваюць яе ад іншых, такімі, як паходжанне, мова, тэрыторыя, палітычная супольнасць, звычаі, традыцыі і рэлігія. Аднак не адзін з гэтых фактараў не з'яўляецца абавязковай умовай яе існавання. Істотную ролю ў фарміраванні культурнай ідэнтычнасці кожнага народа заўсёды меў рэлігійны фактар: для палякаў — гэта каталіцызм, рускіх — праваслаўе, швейцарцаў — кальвінізм і г. д. У італьянскім грамадстве пачуццё ідэнтычнасці таксама абапіраецца на рэлігію [8], якая на працягу многіх стагоддзяў была крыніцай культурнага і духоўнага жыцця. Толькі ў другой палове XIX ст. італьянскі народ стаў атаясамліваць сябе з нацыяй, сваё жыццё і выжыванне – з жыццём і выжываннем нацыі. Чалавек быў абавязаны захоўваць адданасць царкве, а толькі потым – нацыянальнай дзяржаве. Больш за 95 % італьянцаў з'яўляюцца каталікамі.

Італія з'яўляецца краінай, у якой каталіцкая царква надзвычай моцная, і гэта не здзіўляе: з 1929 г. па 26 лістапада 1976 г. каталіцызм лічыўся дзяржаўнай рэлігіяй Італіі. У наш час Царква афіцыйна аддзелена ад дзяржавы і рэгулюе свае адносіны з ёй пры дапамозе спецыяльных дамоў і законаў, у прыватнасці «Новага Канкардата» 1984 г. Матывацыя пашыранага супрацоўніцтва дзяржавы з каталіцкай Царквой у артыкуле 6 Канкардата сфармулявана наступным чынам: «Італьянская Рэспубліка, прызнаючы каштоўнасць рэлігійнай культуры і ўлічваючы, што прынцыпы каталіцызму з'яўляюцца гістарычным наследствам італь-янскага народа...». Папа – адзіны каранаваны ўладар дзяржавы, і з-за такога статусу яго візіты ў італьянскія гарады выклікаюць значна большую цікавасць, чым наведванні прэзідэнта і прэм'ер-міністра. Ён – адзіная ўлада ў Італіі, якая ў стане запоўніць стадыёны народам. Рэлігія, хоць і аддзелена ад дзяржавы, займае важную частку ў выхаванні і культуры. Шматлікія італьянцы не забываюць наведваць імшу, хоць вядуць свецкі лад жыцця. Захоўваюцца асноўныя рэлігійныя таінствы: хрышчэнне, першае прычасце, вянчанне ў царкве, хоць апошнія і не абавязкова (некаторыя аддаюць перавагу свецкаму шлюбу ў мэрыі). Рэлігійная культура італьянцаў, якая з'яўляецца натуральным элементам быту, праяўляецца хутчэй як традыцыя праз сямейнае выхаванне.

Такім чынам, можна з упэўненасцю меркаваць, што рэлігія выконвае «стягивающую» і «цементирующую» ролю, такую неабходную для адзінства грамадзянскага грамадства, фарміруючую цярпімасць да іншых культур і рэлігій. З гэтай прычыны грамадзянская культура італьянскага насельніцтва краіны вельмі высокая.

*ЛіТАРАТУРА*


1. *Эриксон Э.* Идентичность: юность и кризис: Пер. с англ. / общ. ред. и предисл. А. В. Толстых. М., 1996. С. 20.
2. *Бугрова И. И.* Молодое белорусское государство и общество: альянс или мезальянс? // Национальная идентичность Беларуси: материалы семинара / Фонд им. Фридриха Эберта / Под общ. ред. Гельмута Курта. Мн., 2003. С. 7.
3. *Хесле В.* Кризис индивидуальной и коллективной идентичности // Вопросы философии. 1994. № 10. С. 121.
4. Диалог культур и культурная политика государства в полиэтническом регионе // Полиэтнический регион: диалог культур и перспективы развития: Материалы постоянно

действующего регионального научного семинара / редкол. Г. Е. Шкалина (отв. ред.) и др. Йошкар-Ола, 1997. С. 15.
5. *John Haycraft, Italian Labyrinth.* Seeker & Warburg, 1985, p. 1-2.
6. Ernesto Galli Delia Loggia, L'identita' italiana. II Mulino, 1998. 171 p.
7. *Martin Solly,* Xenophobe's Guide to the Italians. Oval Books, 1995.  70 p.
8. *William Ward,* Getting it Right in Italy. Bloomsbury, 1990.

SUMMARY

The article deals with the problem of the identity of the Italians. The regionalism as one of the essential characteristics of the nation is revealed through the concept «campanilismo». It is observed in different spheres of life of the Italian people.